# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 красавіка 2020 г. № 16 (552)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ





## КРОКІ ДА РАДЫЕБЯСПЕКІ






### Якія меры дазваляюць бяспечна жыць і гаспадарыць на постчарнобыльскіх тэрыторыях?

**У выніку аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі доўгажывучымі радыенуклідамі было забруджана 23 % ад усёй тэрыторыі Беларусі. Што сёння адбываецца з гэтымі землямі?**

#### Сітуацыя існуючага апрамянення

У першы перыяд пасля катастрофы на ЧАЭС частка беларускіх зямель была выведзена з гаспадарчага абароту з прычыны высокай шчыльнасці забруджання глеб радыенуклідамі і высокай рызыкі вытворчасці «брудных» сельскагаспадарчай прадукцыі, сыравіны і кармоў. Агульная плошча такіх зямель склала каля 265 тысяч гектараў.

Сёння ж, больш чым праз 30 гадоў пасля аварыі, радыяцыйнае становішча на забруджаных тэрыторыях спецыялісты ацэньваюць як стабільнае, кантралюючае і прадказальнае.

— Ідзе манатоннае зніжэнне доз апрамянення за кошт натуральных фізічных працэсаў (радыяцыйны распад радыенуклідаў, гарызантальная і вертыкальная міграцыя, працэсы выветрывання і паветранага пераносу) і дзейнасці чалавека, — тлумачыць **начальнік службы радыяцыйнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыяцыйнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Міхаіл КАВАЛЕНКА.** — Таму радыяцыйнае становішча, што склалася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, па сучаснай класіфікацыі адносіцца да сітуацыі існуючага апрамянення.

стар. 4

## УЛАСНЫ БОЛЬ І ТРАГЕДЫЯ КРАІНЫ

### Чарнобыльскія землі — крыніца для радыяцыйнай навукі і ўнікальнага экатурызму

**Наша суразмоўца на ўласным вопыце ведае, як аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі змяніла лёсы людзей. Катастрофа напаткала яе, жыхарку Хойніцкага раёна, 14-гадовай дзяўчынай — эмацыянальныя ўспаміны пра эвакуацыю, калоны аўтобусаў з перасяленцамі, разлучаныя сем'і засталіся з ёю на ўсё жыццё. З цягам часу яна вярнулася на сваю малую радзіму, дзе ад майстра вытворчага навучання вучылішча вырасла да намесніка старшыні Хойніцкага райвыканкама. Ужо ў якасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ расказала нашаму карэспандэнту, як цяпер жывуць рэгіёны, пацярпелыя ад аварыі.**

***— Якія ўспаміны ў вас засталіся з падзей вясны 1986 года?***

— Пасля аварыі, у пачатку мая, усіх дзяцей, цяжарных жанчын вывезлі з тэрыторыі раёна. Канешне, успамінаючы ўсё гэта, устрымацца ад слёз немагчыма. Стаяла вялікая колькасць аўтобусаў, куды загружалі дзяцей. Малых аддзялялі ад бацькоў, а тыя беглі за транспартам, падаючы ў дарожны пыл. У сваёй сям'і я была старэйшай, сястра меншая за мяне на пяць гадоў. Нас абедзвюх вывезлі спачатку пад Гомель, размеркавалі ў санаторыі, а потым падзялілі. Маленькіх адправілі на Міншчыну. Нас, старшакласнікаў, — у Віцебскую вобласць. Там на вакзале нас сустракала шмат людзей. І ў свой адрас мы чулі мянушкі «чарнобыльскія вожыкі» — нас сапраўды баяліся, баяліся побач хадзіць, пыталі, ці не свецімся мы ад радыяцыі, цягнулі за валасы, спрабуючы, ці сапраўдныя яны. Было ўсякае, шмат давялося перажыць. Але мы былі падлеткамі, і невялікі ўзрост дапамагаў усё гэта спакойна вытрымаць.



Фота house.gov.by

стар. 3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Вынікі сесіі Савета Рэспублікі



Пра лекі, і пашпарт для рагулі. стар. 2

### Жыццё побач з чарнобыльскай зонай



Там, аказваецца, усё больш будуюцца маладыя сем'і. стар. 13

### Востраў Журавы. Дзе гэта?



Як сын выканаў запавет бацькі. стар. 14

### Якая яна, перадавая?



Клопаты вясковых медыкаў ва ўмовах пандэміі. стар. 15

### І Зарэчча стала вёскай–мемарыялам



Ідэю падказаў стары фотастэнд у «ленінскім кутку». стар. 16